Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт
імя Максіма Танка

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ: НОВАЕ Ў ДАСЛЕДАВАННІ І ВЫКЛАДАННІ

*Матэрыялы Рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі*

**27 сакавіка 1999 года**

**Частка 1**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Мінск 1999

0,3% (они занимали в основном должности конторщиков, переписчиков, чертежников, но были среди них дорожные мастера и чернорабочие).

Национальный состав железнодорожников Беларуси в рассматриваемый период можно определить лишь косвенным путем, используя материалы личных дел. В начале XX в. большинство железнодорожников (68,6%) были по национальности белорусами. К началу первой мировой войны их численность увеличилась на 4,8% и составила 29,6 тыс. человек.

Основной контингент работников железнодорожного транспорта Беларуси составляли лица в возрасте до 40 лет. Лишь небольшая часть (6,6%) рабочих и служащих железных дорог продолжали трудиться в возрасте старше 40 лет.

Преобладающее большинство железнодорожников Беларуси были грамотными. С течением времени уровень грамотности возрастал (с 84% в 1895—1907 гг. до 86,2% в 1908—1913 гг.). Неодинаковой была грамотность среди различных социально-классовых групп железнодорожников. Удельный вес грамотных среди рабочих мастерских и депо был несколько выше и составлял 87,6%, что на 5% выше, чем у фабрично-заводских рабочих.

Женский труд на железнодорожном транспорте не получил широкого применения, как в промышленности Беларуси. Однако в рассматриваемый период наблюдается тенденция к увеличению удельного веса женщин на железнодорожном транспорте. Он вырос с 2,5% в 1895—1907 гг. до 9,5% в 1908—1917 гг. преимущественно в годы войны.

**В. М. Фамін**

## ЧАМУ Ў СВОЙ ЧАС НЕ СФАРМІРАВАЛАСЯ БЕЛАРУСКАЯ БУРЖУАЗНАЯ НАЦЫЯ

Хаця агульнапрызнанага азначэння нацыі ніколі не існавала, як не існуе і зараз, па шэрагу яго састаўляючых есць адзінства поглядаў. Гэта — прызнанне таго, што нацыя характарызуецца пэўным сацыяльна-этнічным адзінствам людзей, якое складваецца пры пераходзе ад феадалізму да капіталізму. Разыходжанні, аднак, тычацца фактараў, якія прывялі да утварэння нацыі.

Большасць буржуазных гісторыкаў і сацыелагаў схільна думаць, што нацыя — гэта супольнасць людзей, якія жадаюць жыць разам. Таму такія фактары, як наяўнасць тэрыторыі, дзяржавы, мовы, эканамічнага адзінства, [illegible] адыходзяць на другарадныя пазіцыі. Марксісцкая тэорыя фарміравання

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

нацыі грунтуецца на базе спалучэння фактараў, якія звязаны са зменнямі ў сацыяльна-эканамічных умовах жыцця, з тымі, што адносяцца да мовы і дзяржаўнасці. Такім чынам, марксісцкі падыход да праблемы нацыі вызначаецца большай комплекснасцю, але ў той жа час у ім недаацэньваецца этна-культурныя і псіхалагічныя фактары, якія ўплываюць на фарміраванне нацыі ў такой жа ступені, як і сацыяльна-эканамічныя.

Агульнавядома, што працэс фарміравання нацый у розных краінах адбываецца па-рознаму, а яго спецыфіка вызначаецца ў асноўным суадносінамі этнічных, эканамічных, дзяржаўна-палітычных і геапалітычных фактараў. Прыклад Беларусі — яскравае таму пацвярджэнне.

Пытанне аб стварэнні буржуазнай нацыі ў беларускай гісторыяграфіі спецыяльна не вывучалася. У той жа час сам гістарычны перыяд, для якога ўласціва было стварэнне нацый, беларускія гісторыкі даследавалі даволі поўна. Размова ідзе аб перыядзе капіталізму, гісторыі якога прысвечаны працы такіх вядомых гісторыкаў, як М. Ф. Болбас, Л. П. Ліпінскі, В. П. Панюціч, К. І. Шабуня, У. І. Пічэта, М. В. Доўнар-Запольскі, Д. А. Дудкоў, К. І. Кернажыцкі, А. І. Кажушкоў, А. Г. Каханоўскі, Х. Ю. Бейлькін, З. В. Шыбека, М. О. Біч, А. П. Жытко і інш. Важнае месца ў асвятленні эпохі капіталізму належыць абагульняючым працам па гісторыі Беларусі, якія былі падрыхтаваны Інстытутам гісторыі Нацыянальнай акадэміі Рэспублікі Беларусь.

Адмена прыгоннага права ў 1861 г. і пераход Расіі на шлях капіталістычнага развіцця паклалі пачатак працэсу фарміравання буржуазных нацый у краіне, асаблівасцю якой з'яўлялася тое, што, акрамя карэннай расійскай, усе іншыя народнасці не мелі сваей дзяржаўнасці. Гэта наложыла адбітак як на тэмпы ўтварэння нацый унутры імперыі, так і на сам яго працэс.

Беларусь адносілася да той часткі Расійскай імперыі, дзе развіццё капіталізму ў парэформенны перыяд адбывалася хаця і ў некалькі запаволенных тэмпах, але ў поўнай адпаведнасці з развіццем яго ў Еўрапейскай Расіі. Гэта значыць, што як прамысловасць, так і сельская гаспадарка Беларусі ішлі па капіталістычнаму шляху развіцця. Ужо на пачатку XX ст. прамысловасць Беларусі, як і Расіі, у значнай меры прайшла стадыю прамысловага капіталізму, хаця ўзровень гэтага развіцця ў Беларусі быў значна ніжэйшы ў параўнанні з асноўнымі прамысловымі цэнтрамі Расіі. У 1913 г. вытворчасць дробнай і саматужнай прамысловасці ў Беларусі складала 53,5%, а буйной — 46,5% [1], тады як у Расіі ўжо ў 1908 г. валавая прадукцыя буйной прамысловасці складала 67% усей валавой прадукцыі [2].



Затое перавагаю Беларусі адносна складвання яе эканамічнага адзінства з'яўлялася стварэнне густой сеткі чыгуначных ліній, якія на пачатак XX ст. звязалі ўсе буйныя гарады і тэрыторыі рэгіена як паміж сабою, так і з эканамічнымі цэнтрамі Расіі, Украіны, Прыбалтыкі, Польшчы.

Развіцце капіталізму ў сельскай гаспадарцы, утварэнне капіталістычных мясцовых (абласных) рынкаў і ўмацаванне сувязі паміж імі стваралі ўмовы для складвання беларускага нацыянальнага рынку. Аднак працэс гэты праходзіў вельмі цяжка, таму што эканамічная еднасць, якая складвалася на Беларусі, не падмацоўвалася дзяржаўным аб'яднаннем у рамках нацыянальнай тэрыторыі. Таму і горад Мінск напрыканцы XIX ст. стаў галоўным гандлева-прамысловым цэнтрам у сувязі са сваім геаграфічным становішчам, а не ў якасці адміністрацыйна-палітычнага цэнтра Беларусі.

Выгаднае геаграфічнае становішча Беларусі абумовіла ўзнікненне на яе тэрыторыі значнай колькасці гандлевых цэнтраў для вывазу на замежны рынак як уласнай, так і прывазной прадукцыі. У сувязі з гэтым А. А. Смоліч пісаў, што на Беларусі «значная частка меставых і местачковых жыхароў займаецца гандлем... дзякуючы значнай лічбе гандляроў і іхняй канкурэнцыі, гандаль (на Беларусі) стаіць досыць добра» [3].

Такім чынам, развіцце рыначных адносін ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі ў парэформены перыяд прывяло да аб'яднання эканомікі Беларусі ў адзінае цэлае. Гэта значыць, што склалася неабходная эканамічная база для фарміравання беларускай буржуазнай нацыі ў Беларусі у эпоху капіталізму.

Аднак фарміраванне нацыі — гэта складванне больш глыбокага унутранага адзінства людзей, і таму сам працэс яе ўтварэння тычыцца непасрэдна этнічных фактараў. Ужо само найменне «буржуазная нацыя» вызначае, што яе асноватворцам з'яўляецца буржуазія, якая па сваім сацыяльна-эканамічным палажэнні становіцца аб'яднаўчай сілай розных этнічных элементаў у адзінае нацыянальнае цэлае. Так яно адбывалася ў еўрапейскіх і другіх краінах свету.

Інакш складаліся абставіны на Беларусі. Калі ў Еўропе нацыі фарміраваліся на базе параўнаўча аднародных у языкавых і этнічных адносінах груп насельніцтва, дык у Беларусі насельніцтва было поліэтнічным. Па даных А. А. Смоліча, перад першай сусветнай вайной у Беларусі пражывала звыш 10 млн. чалавек. З іх беларусаў 8 млн. (77%), яўрэяў 1,5 млн. (14%). Астатнія: рускія — 4%, палякі — 4% і іншыя — 1%. Такім чынам, карэннае беларускае насельніцтва складала пераважную большасць, і таму яму павінна была належыць вядучая роля ў працэсе міжэтнічнай інтэграцыі і ўтварэння беларускай буржуазнай нацыі.



РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

Аднак гэтага не адбылося ў сувязі з прыніжанасцю сацыяльнага статусу беларускага насельніцтва. У пачатку ХХ ст. больш за 90% беларусаў заставаліся сялянамі і пражывалі на весцы. Вядома, што іх уплыў на фарміраванне беларускага нацыянальнага адзінства быў вельмі абмежаваны самімі абставінамі жыцця.

Амаль поўнасцю быў перакрыты доступ беларусам у сферу прадпрымальніцтва, таму сярод буржуазіі яны складалі нязначную велічыню. Па 5 заходніх губернях сярод крупнай гандлева-прамысловай буржуазіі яўрэі складалі 44,7%, палякі — 32,4%, рускія — 15,8%, беларусы — 2,7% [4]. У цэлым на долю беларусаў прыпадала ў гэты час 47,3% агульнай лічбы буржуазіі, аднак гэта была пераважна дробная прамыслова-гандлевая і сялянская буржуазія. Амаль што поўная адсутнасць беларусаў сярод буйной прамыслова-гандлевай буржуазіі з'явілася не толькі вынікам гістарычных умоў фарміравання насельніцтва Беларусі, але і той палітыкі, якую праводзілі царскія ўлады ў адносінах да яе.

Захаванне мяжы аседласці для яўрэяў вяло да іх перанаселенасці, якая на Беларусі складала звыш за 400 тыс. чалавек. Гэта ўскладняла працэс фарміравання беларускага нацыянальнага элемента як сярод буржуазіі, так і сярод пралетарыяту. Сярод наемных работнікаў неземляробчай сферы яўрэі складалі 60%, беларусы — 17,1%, рускія — 10,1%, палякі — 10,2% і г.д. [5]. У цэлым на долю нацыянальнага беларускага рабочага класа і буржуазіі прыходзілася толькі каля 2% ад усей колькасці беларусаў, якія пражывалі на сваей радзіме.

Зразумела, што выканаць ролю збіральніка нацыі яны былі не ў стане. Да таго ж яўрэйскае насельніцтва Беларусі, якое іграла вядучую ролю ў гандлева-прамысловай, банкаўскай і іншых сферах эканомікі, не было схільным да інтэграцыі ў адзіную беларускую нацыю. Яно ў большай ступені атаясамлівала сябе з расійскай супольнасцю. Так, гісторык яўрэйскага народу ў Расіі Юлій Гессен пісаў: «Вследствии раздела польских земель между Россией, Австрией и Пруссией к России отошла обширная территория, обычно именуемая Белоруссией, с густым еврейским населением» [6]. Як бачым, для яўрэяў Беларусь — гэта толькі так званая частка тэрыторыі Расіі. Не было згоды аб'яднацца на беларускай культурна-языкавой базе і з боку рускіх, а таксама палякаў, якія пражывалі ў Беларусі. А гэта азначае, што ў сацыяльна-класавай структуры беларускага грамадства не склаліся на этапе капіталізму неабходныя ўмовы для фарміравання беларускай буржуазнай нацыі. Не спрыяла гэтаму адсутнасць уласнай дзяржаўнасці. У загане знаходзілася і беларуская мова, якая аказалася не ў стане стаць аб'яднаўчым фактарам на шляху складвання



нацыі. Таму і рух за нацыянальнае адраджэнне ў другой палове XIX — пачатку ХХ ст. на Беларусі не прывеў да стварэння беларускай нацыі.

**Літаратура**

1. Эканамічная гісторыя Беларусі. Выд. 2-е. Мн., 1996. С. 182.
2. Россия. 1913 год. Статистико-документальный справочник. СПб., 1995. С. 56.
3. Смоліч А. А. Геаграфія Беларусі. 4-е выд. Мн., 1993. С. 185—186.
4. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Мн., 1994. Т. 2. С. 137.
5. Бич М. О. Рабочее движение в Белоруссии в 1861—1914 г. Мн., 1983. С. 29.
6. Гессен Юлий. История еврейского народа в России. М., 1993. С. 21.

**А. И. Федкович**

## БОЛГАРСКИЙ ЭТНОС В РОССИИ И БЕЛАРУСИ (XIX—XX вв.)

В XIX в. главнейшее водворение болгар в Россию происходило между 1801 и 1812 гг. Тогда в Буджак прибыло около 3 тыс. семей [1]. Император Александр I своим высочайшим указом от 25 декабря 1801 г. велел прибывших болгар принять в Российское подданство. В 1804 г. прибыло большое и неожиданное количество болгар из Турции и из-за Днестра, которые поселились в Херсонской губернии. В 1806 г. прибыло из Анатолии к Евпаторийскому порту несколько болгарских семейств, искавших в России убежище и хлеб. В 1819 г. под поселение всех этих иммигрантов русское правительство отвело особую часть казенных земель в западной части Буджака [1].

Самое крупное переселение состоялось в 1828, 1834 гг., которое явилось исторически необходимым и массовым переселением в Бессарабию значительной части населения Юго-Восточной Болгарии и сыграло особенно заметную роль в формировании болгарских поселений в России. Переселение болгар в Россию в связи с русско-турецкой войной 1828—1829 гг. осуществлялось в три этапа. На первом этапе — непосредственно в период войны — лишь небольшое число иммигрантов прибыло в пределы России, в основном в Буджак и в Дунайские княжества. Второй этап характерен массовым выходом болгар в Южную Бессарабию и другие области России, а также в Валахию и Молдавию, охватывает 18-месячный период — с сентября 1829 по март 1831 г. [2]. Завершающим этапом является то время, когда значительная часть иммигрантов по разным



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ